# Без лішняга ажыятажу

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі вядзе перагаворы аб набыцці двух рэдкіх выданняў**

“Цяпер шчыльна працуем над двума вельмі каштоўнымі выданнямі з беларускай кніжнай культуры. Яны ацэньваюцца дзясяткамі або нават сотнямі тысяч долараў. Мы спадзяемся, што вынік будзе плённым”, — сказаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі.

Ён не ўдакладніў, пра якія менавіта выданні ідзе размова, паколькі пошук падобных рарытэтаў і перагаворы аб іх набыцці вельмі няпростыя. “Публічнае апавяшчэнне ў большасці выпадкаў працуе “супраць”, а не “за”, — растлумачыў суразмоўца.

Паводле слоў Рамана Матульскага, 2012 год, які прайшоў у Беларусі пад знакам Года кнігі, быў для Нацыянальнай бібліятэкі вельмі рэзультатыўным — удалося набыць больш за 150 рэдкіх і каштоўных выданняў.

“Сярод іх сапраўдная рэдкасць — кніга Казіміра Семяновіча “Вялікае мастацтва артылерыі”, першае выданне ў Амстэрдаме 1650—1651 гадоў. Казімір Семяновіч — наш зямляк, які паклаў аснову сусветнаму ракетабудаванню, у яго вучыліся Напалеон і Пётр Першы, Каралёў і Цыялкоўскі. Вяртанне гэтага рарытэта — сведчанне таго, што наша краіна і ў тыя часы мела высокаразвітую навуку”, — падкрэсліў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі.

Раман Матульскі дадаў, што асноўная місія бібліятэкі — збіраць і захоўваць кніжную спадчыну краіны.

